# МОДУЛЬНЫ ПАДЫХОД ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА”

***В.С. Новак***
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі

Кампетэнтнасны падыход у сістэме вышэйшай адукацыі надзвычай важны для падрыхтоўкі сучасных спецыялістаў і дасягнення імі прафесіяналізму ў той ці іншай галіне ведаў. Менавіта Балонкі працэс паспрыяў развіццю і ўкараненню прынцыпаў кампетэнтнаснай метадалогіі ў адукацыйнай прасторы. Як слушна падкрэсліў прафесар А. Макараў, “скіраванасць Балонскага працэсу ў многім вызначаецца пераарыентацыяй адукацыйнай прасторы з “уваходных паказчыкаў” (тэрміны навучання, змест, мэты, сфармуляваныя для ВНУ і выкладчыкаў) на параметры кампетэнцыі і вынікаў” [1, с. 15].

Зыходзячы з вышэйсказанага, выкладчыкі павінны пераарыентавацца ў адукацыйным працэсе і максімальна актывізаваць дзейнасць студэнтаў, бо непазбежным з’яўляецца пераход вышэйшай школы ад кваліфікацыйнай парадыгмы да кампетэнтнаснай. У сувязі з гэтым важным з’яўляецца модульнае навучанне. Модуль у класічным разуменні – гэта своеасаблівы комплекс, у якім прыярытэт належыць структурным кампанентам і для якога характэрна пэўная недаацэнка сувязей паміж імі. Даследчыкі А.П. Лабанаў і Н.В. Драздова сцвярджаюць, што “ў нашай адукацыйнай мадэлі мы разглядаем модуль як сістэму (або падсістэму), што дазваляе падкрэсліць ролю асобнага модуля як адносна самастойнага кампанента ведаў у цэласнай іерархічнай структуры і адначасова рэалізоўваць канкрэтную тэхналогію навучання. На наш погляд, размова можа ісці аб трох узроўнях выкарыстання модульнага падыходу: на мікра-, меза- і макраўзроўнях” [2, с. 11].

Да ліку абавязковых структурных элементаў вучэбнага модуля па дысцыпліне “Фалькларыстыка” адносяцца наступныя: уводзіны ў модуль, зместавая частка (лекцыйны матэрыял), практычны модуль, асноўныя формы самастойнай работы, тэст-кантроль.

Засяродзім увагу на мікраўзроўневым характары выкарыстання модульнага падыходу пры выкладанні лекцыйнага матэрыялу, звязанага з тэорыяй фальклору. Модульнае прадстаўленне асобнай тэмы “Фальклор як від мастацтва” дазваляе падкрэсліць важную ролю

гэтага модуля як самастойнага кампанента ведаў у цэласнай структуры ў адпаведнасці з тэматыкай вучэбнай дысцыпліны “Фальклярыстыка”. З пункту гледжання сістэмнай метадалогіі, сутнасць вышэйназванага модуля раскрываецца лектарам як адметны алгарытм, які дапамагае ўсвядоміць, наколькі цесна звязаны паміж сабой усе зместавыя кампаненты вучэбнай дысцыпліны. Без усвядомленага разумення зместу тэарэтычнага модуля “Фальклор як від мастацтва” немагчыма глыбокае і лагічнае вывучэнне зместу іншых тэматычных модуляў. У сувязі з гэтым лектар засяроджвае ўвагу студэнтаў на такіх актуальных пытаннях фальклярыстыкі, як:

– фальклор – мастацтва слова;

– фальклор і літаратура – адметныя віды мастацтва;

– спецыфіка фальклору;

– жанравая сістэма беларускага фальклору;

– значэнне фальклору.

У дадзеным выпадку сутнасць кампетэнцыі – гэта тэарэтычныя веды, неабходныя для вырашэння практычных задач (напрыклад, уменне вызначаць у палявых экспедыцыях жанры і віды вусна-паэтычных твораў), а таксама прагназаванне і мадэляванне важных элементаў пры даследаванні тых ці іншых тэарэтыка-практычных праблем фальклярыстыкі. Важна, каб студэнты зразумелі, што фальклор і літаратура аб’яднаны агульнасцю родавай прыметы, сутнасць якой – у прыналежнасці да мастацкай творчасці. Відавая ж прымета, што адрознівае фальклор ад літаратуры, – гэта працэс вуснай масавай непрафесійнай творчасці, заснаванай на традыцыях.

Лектар, раскрываючы сутнасць трох асноўных дэфініцый фальклору, адзначае, што ў апошні час у фальклярыстыцы пераважае канцэптуальнае азначэнне гэтага віду мастацтва як комплекснага, поліэлементнага і поліфункцыянальнага. Задача лектара – пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі, якія ўтвараюць каркас навуковых ведаў па дысцыпліне “Фальклярыстыка” і якія павінны быць засвоены ў працэсе навучання. У прадстаўленым гласарыі важнае месца адводзіцца паняццю “фальклорны тэкст”, асноўнымі складаемымі якога з’яўляюцца тэкст, мастацкі свет (персанажна-сюжэтная сфера), мастацкі змест (ідэйна-сэнсавая сфера).

Аналіз фальклорных тэкстаў варта праводзіць, абапіраючыся на такія катэгорыі, як сінтактыка (марфалогія тэксту), семантыка (значэнне, сэнс элементаў у іх суаднесенасці са знешнім светам), прагматыка (высвятленне стасункаў паміж тэкстам і тым, хто яго ўспрымае, інтэрпрэтуе). У гэтых адносінах імпануе вопыт

фалькларыста, дацэнта кафедры тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Р.М. Кавалёвай, якая знаёміць студэнтаў не толькі з названымі паняццямі, але і з такімі катэгорыямі, як наратыў, канцэпт, а таксама раскрывае асноўны змест тыпаў сусветнага фальклору (архаічны, класічны, сучасны і постфальклор).

Высвятленне сутнасці спецыфічных рысаў фальклору (вуснасць бытавання, наяўнасць варыянтаў і версій, дыялектычныя суадносіны індывідуальнага і калектыўнага, традыцыйнасць, сінкрэтызм, аптымізм) – умова паспяховага засваення іншых лекцыйных тэм, як тэарэтычных, так і звязаных з вывучэннем канкрэтных жанраў вуснай народнай творчасці, з асаблівасцямі яе гістарычнага развіцця. Абгрунтоўваючы прынцыпы класіфікацыі фальклорных жанраў, лектар звяртае ўвагу студэнтаў на сутнасць такіх паняццяў, як род (спосаб адлюстравання рэчаіснасці) і жанр (тып мастацкай формы). У фалькларыстычнай літаратуры прымяняюцца дзве класіфікацыі фальклору – філалагічная (якая зыходзіць з уяўлення аб фальклоры як аб мастацтве слова) і мастацтвазнаўчая (або агульная – аб’ядноўвае славесныя, музычныя, песенныя, харэаграфічныя, гульнёвыя, драматычныя і тэатральныя формы фальклору, або спецыяльная для кожнай з названых форм). Найбольш аўтарытэтнай з’яўляецца філалагічная класіфікацыя, у аснове якой ляжыць паэтыка ў спалучэнні з такімі другаснымі крытэрыямі, як форма выканання, у прыватнасці адносіны вербальнага тэксту да музыкі.

Модульная арганізацыя зместу вучэбнай дысцыпліны, як правіла, уключае многія структурныя кампаненты: ключавыя словы, тэматычны план, змест дысцыпліны, формы самастойнай работы, спіс літаратуры, заданні для падрыхтоўкі тэматычнага партфоліа і кантрольныя пытанні, тэрміналагічны мінімум. Прапанаваная тэма “Фальклор як від мастацтва”, прадстаўленая на мікраўзроўні, можа быць пашырана да статусу спецкурса, што характэрна для мезаўзроўню. Адзначым, што пры гэтым логіка выкладання не парушаецца, а лекцыйны матэрыял пашыраецца і ўзбагачаецца.

Спіс літаратуры

1. Научно-методические инновации в высшей школе / под общ. ред. проф. А.Ф. Макарава. – Минск : РИВШ, 2008. – 186 с.

2. Лобанов, А.П. Модульный подход в системе высшего образования / А.П. Лобанов, Н.В. Дроздова. – Минск : РИВШ, 2008. – 84 с.